Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Часта можна пачуць параду: «Знішчыце на сваім участку мурашак! Тля? — гэта мурашы! Мала труціць тлю, трэба знішчыць мурашак!» Паспрабуем іх абараніць.**

# Мурашы: за і супраць

Сваімі кветнікамі, агародамі, садамі мы ўмешваемся ў светаўладкаванне і парушаем прыродныя законы. Нават калі вы за «прыроднае земляробства», то вы гэтыя законы парушаеце, праўда, у меншай ступені. У прыродзе першапачаткова ўсё ўладкавана інакш і дзейнічаюць іншыя законы. Таму трэба імкнуцца хоць бы мінімізаваць шкоду, якая наносіцца нашым «прычыненнем дабра навакольнаму асяроддзю».

Гаворка выключна аб мурашках, якія селяцца ў садзе і ў агародзе.

Так, сапраўды, мурашкі разводзяць і разносяць (могуць разносіць кукалкі, але не ўсе мурашкі і не заўсёды) тлю. Лоўчыя паясы выдатна засцерагаюць ад пашкоджання кроны і парасткаў тлёй, якая разносіцца мурашкамі. Дарэчы, тля выдатна існуе і асобна ад мурашак і мурашнікаў.

Так, сапраўды, мурашкі, пабудаваўшы мурашнік «у непадыходзячым» (для чалавека!) месцы, могуць пашкодзіць каранёвую сістэму некаторых раслін і сілкуюцца сокам бутонаў некаторых кветак.

Але! Гэтыя казюркі здольныя ачысціць участак ад іншых шкоднікаў, напрыклад, павуціннага кляшча, трыпсаў, вусеняў і іх кукалак, нават смажкоў.

Вядома, што пядзенікі і пільшчыкі знішчаюць расліны і тым самым наносяць велізарную шкоду дрэвам. Але там, дзе ёсць мурашнік, колькасць гэтых шкоднікаў невялікая.

Адзін мурашнік здольны за суткі знішчыць да тысячы шкоднікаў.

Перамяшчаючыся ў верхніх пластах грунту, мурашкі рыхляць і ўзбагачаюць кіслародам глебу, гэтыя месцы засяляюць грыбы-сапрафіты, якія паляпшаюць трофіку (клетачнае сілкаванне) раслін. Мурашкі актыўна ўдзельнічаюць у глебаўтварэнні, спрыяючы раскладанню раслінных рэштак.

Глеба каля мурашнікаў узбагачаецца карысными мікраэлементамі. У зонах мурашніка павялічваецца ўтрыманне калію і фосфару, паколькі ў працэсе жыццядзейнасці членістаногія вылучаюць гэтыя мікраэлементы, якія лёгка засвойваюцца дрэвамі і садова-агароднымі культурамі.

Перш, чым пачынаць знішчэнне мурашніка, варта задумацца, а ці настолькі вялікая шкода, якую прычыняюць вам насякомыя? Можа, у парыве зрабіць свой участак стэрыльна бездакорным, мы самі сабе аказваем мядзведжую паслугу і губім памагатага?

Перад ужываннем «чарадзейнага сродку ад мурашак» уважліва вывучыце інструкцыю, асабліва ў частцы ўтылізацыі і тэрмінаў выхаду на апрацаваную тэрыторыю. Бо часта гэтыя прэпараты маюць у складзе фіпраніл і адносяцца да высока небяспечных (2 клас) і ўмерана небяспечных рэчываў (3 клас) для чалавека і іншых млекакормячых. Для птушак, пчол і водных беспазваночных фіпраніл высока таксічны, для рыб і глебавых чарвякоў умерана таксічны. Або хлорпірыфос, прэпараты на аснове якога належаць да 2 і 3 класаў небяспекі.

# Для хуткага завязвання пекінскай капусты

**Часта агароднікі сутыкаюцца з такой праблемай: капуста расце добра, у яе выдатна фарміруецца каранёвая сістэма і нарастаюць лісты, але качан доўгі час не жадае завязвацца. Бывае наогул, што капуста так і застаецца без качана, са стрэлкамі ці проста з пухнатым лісцем. Што ў гэтым выпадку можна зрабіць?**

Вельмі карысны і дзейсны лайфхак ніжэй дапаможа вам вырашыць такую праблему — ужо праз 5-7 дзён вы не пазнаеце капусту, якая расце ў вас на агародзе!

Для гэтага вам спатрэбяцца звычайныя капронавыя калготкі. Можаце ўзяць старыя, якія даўно не носіце.

Наразаем калготкі на кавалачкі па 10 см даўжынёй.

Добра расцягваем атрыманую імправізаваную гумку рукамі. Акуратна згортваем капусту і надзяваем капронавую гумку на расліну, не пашкоджваючы лісце. Гумка вельмі добра цягнецца і не моцна сцягвае капусту, а значыць не можа яе пашкодзіць.

Вось так выглядае капуста ў канцы работы — лісце не сцягнутае занадта моцна, але ў той жа час досыць шчыльна прыціснутае разам.

Такая працэдура дазволіць капусце завязацца за некалькі дзён. Вядома, таксама важны правільны догляд за раслінай. Тым не менш, калі вы ўжо сутыкаліся з тым, што капуста ніяк не хоча завязвацца, паспрабуйце гэты лайфхак — ён выдатна працуе!







Даты | Падзеі | Людзі

**21 ВЕРАСНЯ**

У краіне



**1903** год — нарадзіўся Іосіф Аляксандравіч Бельскі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі.

**1918** год — нарадзіўся Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі, беларускі мовазнаўца, пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар. Заснавальнік беларускай фразеалогіі.

**1923** год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Барысевіч, фізік, акадэмік НАН Беларусі, АН СССР, РАН, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, замежны член Славенскай акадэміі навук і мастацтваў, замежны член Чэхаславацкай АН, правадзейны член Еўрапейскай акадэміі навук, мастацтваў і славеснасці, ганаровы доктар прыродазнаўчых навук Енскага ўніверсітэта імя Фрыдрыха Шылера. Аўтар больш за 300 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1948** год — нарадзілася Людміла Карпаўна Шлег, беларускі кампазітар. Лаўрэатка прэміі «За духоўнае адраджэнне».

**1958** год — нарадзіўся Алег Мікалаевіч Елісеенкаў, беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

У свеце

**1708** год — нарадзіўся Анціох Дзмітрыевіч Кантэмір, рускі паэт, перакладчык, дзяржаўны дзеяч, дыпламат, адзін з заснавальнікаў рускага класіцызму ў жанры вершаванай сатыры.

**1853** год — нарадзіўся Хейке Камерлінг-Онэс, нідэрландскі фізік, адзін з заснавальнікаў фізікі нізкіх тэмператур, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы за даследаванні уласцівасцяў рэчываў пры нізкіх тэмпературах.



**1868** год — нарадзілася Вольга Леанардаўна Кніпер-Чэхава, руская актрыса, народная артыстка СССР.

**1908** год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Асенеў, расійскі акцёр, народны артыст РСФСР.

**1933** год — 21 верасня — 23 снежня ў Лейпцыгу адбыўся інсцэніраваны нацыстамі судовы працэс супраць камуністаў, абвінавачаных у падпале рэйхстага. Галоўным абвінавачаным на працэсе быў балгарскі камуніст Георгій Дзімітраў.

Так гаварыў...

**ІМАНУІЛ КАНТ:**

*«Калі справядлівасць знікае, то не застаецца нічога, што магло б надаць каштоўнасць жыццю людзей».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.53 | 19.12 | 12.19 |
| Віцебск — | 6.42 | 19.02 | 12.20 |
| Магілёў — | 6.43 | 19.02 | 12.19 |
| Гомель — | 6.40 | 18.58 | 12.18 |
| Гродна — | 7.08 | 19.27 | 12.19 |
| Брэст — | 7.09 | 19.27 | 12.18 |

## Месяц

*Маладзік 15 верасня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.*** НАРАДЖЭННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ. *Марыі, Георгія.*
***К.*** *Аляксандра, Іпаліта, Мацея.*



Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Вы нічога не маеце супраць, калі мы заўтра разам павячэраем?**
**— Вядома, з задавальненнем!**
**— Ну, тады заўтра а восьмай у вас.**

— А я кажу, што курыца!
— Не, я лічу — яйка!
— Здароў, філосафы! Між іншым, ды будзе вам вядома, пытанне аб курыцы ці яйку цікавіла людзей яшчэ ў Старажытным Рыме і...




— Пятровіч, што ты вярзеш! Якая ім была розніца, што ў нас хутчэй даражэе?

**— Ты не ведаеш, на што я здольны.**
**— Ні на што.**
**— А не, ведаеш.**

Навошта робяць татуіроўку на шыі? Калі татуіроўку дрэнна відаць, то пара мыць шыю.

**— Тата, ну чаму ты думаеш, што калі я была на дні нараджэння, то адразу піла?**
**— Я мама.**

— Ёсць што-небудзь выпіць?
— Вада.
— А мацней?
— Лёд.

**— Што вам пакінуў бацька ў спадчыну?**
**— Толькі розум.**
**— І куды ж вы яго падзелі?**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.387. Індэкс 63850. Зак. № 2240.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 верасня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12